проектирование конструктора виртуального детского сада, образовательная деятельность на базе консультационных центров.

Критериями эффективности сотрудничества на первом этапе могут стать заинтересованность родителей, их вопросы и сомнения, а далее — активное участие в совместных мероприятиях, инициатива во взаимодействии.

**Заключение.** Проблема оценки качества дошкольного образования сложна и недостаточно изучена. На наш взгляд, остаются нерешёнными некоторые вопросы:

1) выбор критериального аппарата оценки качества образования (нормы зачастую отстают от развития науки, не всегда соответствуют многообразию социальных условий);

2) может ли ребёнок стать субъектом оценки тех образовательных условий, в которых он находится;

3) насколько коллектив ДОО готов к объективной оценке? Готов ли он признать, озвучить выявленные проблемы, а самое главное — грамотно их решать;

4) при внешней экспертизе встаёт проблема выбора экспертов. Кто будет высказывать мнение, как это мнение получить;

5) как перейти с формальной «инспекторской» оценки на различные виды независимых экспертиз, предлагая инициативу родителям, представителям профессионального сообщества, профсоюзам.

Эти и другие вопросы в настоящее время активно поднимаются и решаются в системе дошкольного образования Российской Федерации.

**Список цитируемых источников**


1. Об образовании в Российской Федерации [Электронный ресурс] : Федер. закон от 29.12.2012 № 273-ФЗ : в ред. от 25.11.2013 : с изм. и доп. от 01.01.2014. — Режим доступа: http://www.consultant.ru/document/cons_doc_LAW_140174/ . — Дата доступа: 05.12.2020.
2. *Белая, К. Ю.* Дошкольное образовательное учреждение — управление по результатам [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://dob.1sept.ru/article.php?ID=200502309 . — Дата доступа: 05.12.2020.
3. *Бережнова, О.* Оценка профессиональной деятельности педагога детского сада / О. Бережнова, Л. Тимофеева. — М. : Цветной мир, 2014. — 132 с.
4. *Богославец, Л. Г.* Управление качеством дошкольного образования / Л. Г. Богославец, А. А. Майер. — М. : Сфера, 2009. — 128 с.
5. Навигатор образовательных программ дошкольного образования [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https: //firo.ranepa.ru/navigator-programm-do . — Дата доступа: 05.12.2020.
6. *Лашкова, Л. Л.* Наследие Югры: на пути к истокам : парц. программа формирования ценност. отношения к природе и культуре ХМАО-Югры у детей ст. дошк. возраста / Л. Л. Лашкова, П. П. Ушакова, С. А. Якоб ; под науч. ред. Л.Л. Лашковой. — М. : Рус. слово — учеб., 2019. — 112 с.
7. Федеральный государственный образовательный стандарт дошкольного образования [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://firo.ranepa.ru/files/docs/do/fgos/pr1155.pdf . — Дата доступа: 05.12.2020.


УДК 371.72

**Лявіцкая Ала Дзмітрыеўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навамышскі яслі-сад», в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна, Рэспубліка Беларусь, novomyshskiy-sad@Baranavichy.edu.by*

## АРГАНІЗАЦЫЯ АКЦЫЙ ЯК ПАРТНЁРСКАЯ ФОРМА СУПРАЦОЎНІЦТВА ЎСІХ УДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

У артыкуле абгрунтавана магчымасць арганізацыі акцый ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Адзначаецца каштоўнасць акцый для выхавання і развіцця дзіцяці дашкольнага ўзросту, супрацоўніцтва і ўсталявання партнёрскіх адносін з сям'ёй. Прапанаваны віды тэматычных і дабрачынных акцый.

**Ключавыя словы:** акцыя; партнёрства; супрацоўніцтва; дабрачыннасць.

**Lyavitskaya Ala Dzmitryeina**
*Novaya Mysh Nursery-kindergartden, Novaya Mysh, Baranavichy district, Belarus, novomyshskiy-sad@Baranavichy.edu.by*

## ORGANIZATION OF ACTIONS AS A PARTNERSHIP FORM OF COOPERATION OF ALL PARTICIPANTS IN THE EDUCATIONAL PROCESS

The article substantiates the possibility of organizing actions in a preschool institution. The value of actions for the upbringing and development of preschool children, cooperation and the establishment of partnerships with the family is noted. Types of thematic and charitable actions are proposed.

**Key words:** action; partnership; cooperation; charity.

© Лявіцкая А. Д., 2021



Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Абнаўленне сістэмы дашкольнай адукацыі, працэсы гуманізацыі і дэмакратызацыі ў ёй абумовілі неабходнасць актывізацыі ўзаемадзеяння дашкольнай установы з сям'ёй.

Сям'я і ўстанова дашкольнай адукацыі — два выхаваўчых інстытута, кожны з якіх па-свойму дае дзіцяці сацыяльны вопыт, але толькі ў спалучэнні адзін з адным яны ствараюць аптымальныя ўмовы для ўваходжання маленькага чалавека ў вялікі свет.

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі бацькі з'яўляюцца суб'ектамі грамадскіх адносін у сферы адукацыі, удзельнікамі адукацыйнага працэсу. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, якая вызначае змест дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, арыентуе педагогаў на партнёрскія адносіны з бацькамі, супрацоўніцтва і сатворчасці. Менавіта ў працэсе такога ўзаемадзеяння ўдасканальваецца актыўная педагагічная пазіцыя бацькоў і педагогаў, фарміруецца адзінства поглядаў на дзіця як на самакаштоўнасць, унікальную асобу [1].

Паняцце «партнёрства» мае на ўвазе тое, што сям'я і ўстанова дашкольнай адукацыі дзейнічаюць у раўнапраўным супрацоўніцтве ў дасягненні агульных мэтаў.

Адной з прыярытэтных задач дзейнасці ўстановы дашкольнай адукацыі з'яўляецца арганізацыя асобасна арыентаванага ўзаемадзеяння з сем'ямі выхаванцаў, накіраванага на ўстанаўленне партнёрскіх адносін на аснове канструктыўнага дыялогу. Усё гэта непарыўна звязана з узрастаннем актыўнасці сем'яў у выхаванні і развіцці дзяцей, іх уключанасцю ў сучаснае адукацыйнае асяроддзе. Сям'я і ўстанова дашкольнай адукацыі ў роўнай ступені адказныя за ўмовы выхавання і развіцця асобы дзіцяці [2].

**Асноўная частка.** Калі пачынаецца новы навучальны год, перад адміністрацыяй дзяржаўнай установы адукацыі «Навамышскі яслі-сад» стаяць такія задачы, як згуртаванне калектыва на аснове вырашэння агульных задач і прынцыпаў, стымуляванне творчага пошуку, стварэнне спрыяльнага творчага асяроддзя не толькі з педагогамі, але і з бацькамі дашкольнікаў для вырашэння адной агульнай задачы — выхавання і развіцця дзіцяці дашкольнага ўзросту.

Развіццё дзяцей можа быць паспяховым толькі пры ўмове цеснага супрацоўніцтва дзіцячага сада і сям'і. Поспех супрацоўніцтва сям'і і ўстановы дашкольнай адукацыі залежыць ад узаемных установак, даверу адно да аднаго, усвядомленасці мэтанакіраванага ўздзеяння на дзіця.

Адной з інтэрактыўных форм работы з бацькамі ў нашай установе дашкольнай адукацыі з'яўляецца правядзенне тэматычных і дабрачынных акцый, якія накіраваны на супрацоўніцтва сям'і ў вырашэнні праблем адукацыі і выхавання дзяцей, павышэння ролі і адказнасці бацькоў у справе грамадзянскай адукацыі і выхавання дзіцяці.

Акцыя (лат. action) — гэта ўчынак, дзеянні, што прымаюцца для дасягнення якой-небудзь мэты. Акцыі могуць быць прымеркаваны да нейкай падзеі, даты, свята. Такая форма работы дазваляе ахапіць дзяцей і бацькоў групы і нават усёй установы дашкольнай адукацыі. Гэтыя мерапрыемствы простыя ў выкананні і дазваляюць на працягу кароткага адрэзку часу атрымаць значны па важнасці вынік: ствараецца спрыяльнае асяроддзе для павышэння колькасці кантактаў бацькоў з педагогамі, фарміруюцца станоўчыя адносіны бацькоў да дзіцячага сада, ствараюцца ўмовы для ўстанаўлення кантакту са сваімі дзецьмі.

Асноўная мэта акцый: прыцягненне ўвагі ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу ўстановы дашкольнай адукацыі да праблемы, далучэнне бацькоў да актыўнай практычнай дзейнасці, кансалідацыя намаганняў і фарміраванне станоўчых узаемаадносін паміж калектывам установы і бацькамі. Яны служаць добрай прапагандай сярод бацькоўскай грамадскасці. Дзеці бачаць стаўленне бацькоў, арганізацыю мерапрыемства і самі ў ім удзельнічаюць. Асаблівая каштоўнасць акцый заключаецца ў тым, што, удзельнічаючы ў іх, дзіця набывае ўласны вопыт, асвойвае і асэнсоўвае свет, актыўна будуе веды на аснове папярэдняга вопыту ў самастойнай і сумеснай дзейнасці, у зносінах з дарослымі і аднагодкамі, становячыся паўнавартасным удзельнікам адукацыйнага працэсу (Л. С. Выгоцкі) [3].

Тэматыка акцый педагогам прапануецца загадзя. У далейшым ідзе творчы пошук, нестандартнае рашэнне. Актыўнае ўключэнне педагогаў у стварэнне акцыі — гэта магчымасць стаць асноўнымі распрацоўшчыкамі і выканаўцамі шэрагу дзеянняў для дасягнення мэты. Педагогі вызначаюць праблемы, прапануюць шляхі іх вырашэння і самі разам з дзецьмі і іх бацькамі ажыццяўляюць іх, павялічваючы свой творчы і прафесійны ўзровень. Пры правядзенні акцый педагогі праз накіраваную арганізаваную дзейнасць дзяцей вырашаюць педагагічныя задачы: паглыбленне ведаў, выхаванне якасцей асобы, набыццё вопыту жыцця сярод аднагодкаў, дарослых.

Традыцыяй нашай установы дашкольнай адукацыі стала правядзенне тэматычных акцый сумесна з бацькамі.

У мэтах прафілактыкі дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей у цёмны перыяд часу, папулярызацыі выкарыстання святловяртальных элементаў у дзіцячым садзе праходзіць акцыя «Стань заўважным на дарозе!». Праводзяцца гутаркі, заняткі, дзе дзеці знаёмяцца з правіламі паводзін на дарогах і за межамі ўстановы дашкольнай адукацыі. У дыдактычных, сюжэтна-ролевых і рухомых гульнях выхаванцы вучацца самастойна прымаць рашэнні, выконваць правілы дарожнага руху. На стэндах размешчана адпаведная інфармацыя для бацькоў, праводзіцца тлумачальная работа з бацькамі па недапушчэнні перамяшчэння на неасветленых участках праезжай часткі вуліцы без наяўнасці флікераў. Дзецям, якія прыходзяць у дзіцячы сад з флікерам, педагогі дораць на памяць магніты, флікеры, настольныя гульні, размалёўкі.

Рэпазіторый БарДУ

Каб у дзіцяці сфарміраваць экалагічную культуру (любоў да прыроды, усяго жывога, чуласць да навакольнага свету, уменне даглядаць за раслінамі і жывёламі, суперажываць), у дзіцячым садзе праводзяцца экалагічныя акцыі.

Традыцыйны клопат аб зімуючых птушках праходзіць у рамках акцыі «Пакарміце птушак зімой!». Мэта акцыі: сфарміраваць у дзяцей прадстаўленні пра асаблівасці жыцця і паводзін птушак у халодную пару года; развіваць пазнавальны інтарэс да прыроды; выклікаць у дзяцей спачуванне да птушак, якія пакутуюць зімой ад холаду і голаду; жаданне і гатоўнасць ім дапамагаць. Дзеці назіраюць за птушкамі, праводзяць абмеркаванне, разам з татамі вырабляюць кармушкі. У выніку акцыі ў дзяцей і дарослых сфарміравалася пэўная сістэма прыродазнаўчых ведаў, якая дазваляе ўсвядоміць адзінства ўсёй прыроды і месца чалавека ў ёй.

Вясной праходзіць акцыя «Кожнай птушцы па доміку». Бацькі пабудавалі шпакоўні, якія гасцінна сустрэнуць першых птушыных пасланцаў вясны. На прагулцы шпакоўні павесілі на пляцоўцы сада. Дзеці з цікавасцю і захапленнем назіралі за правядзеннем работ.

Акцыя «Пасадзі дрэва». Мэта акцыі: адраджэнне і ўмацаванне традыцыі ўстановы дашкольнай адукацыі ў азеляненні тэрыторыі сіламі выпускнікоў, бацькоў і педагогаў, захаванне пераемнасці пакаленняў, умацаванне знешніх сацыяльных сувязяў. На тэрыторыі ўчастка ўстановы дашкольнай адукацыі былі высаджаны саджанцы яблыні. Выхаванцы маглі назіраць і ўдзельнічаць у пасадцы дрэў. Гэтыя дрэвы прынясуць карысць і не раз пацешаць сваімі сакавітымі пладамі не адно пакаленне дзетак — нашых будучых выхаванцаў.

У 2019 годзе была закладзена «Алея выпускнікоў», пра што сведчыць выгравіраваная таблічка. Туі, высаджаныя бацькамі выхаванцаў, будуць нагадваць наступным пакаленням аб выпускніках.

Пара летніх канікул вельмі прыемная, але можа быць небяспечнай для маленькіх веласіпедыстаў. У рамках праекта па бяспецы жыццядзейнасці педагогі разам з выхаванцамі выйшлі за межы дашкольнай установы з акцыяй «Будзь уважлівы, маленькі веласіпедыст». Дзецям малодшага дашкольнага ўзросту і іх бацькам нагадалі аб правілах паводзін на дарозе.

Стала добрай традыцыяй калектыву дзяржаўнай установы адукацыі «Навамышскі яслі-сад» арганізоўваць дабрачынныя мерапрыемствы з мэтай дапамагчы дзецям і людзям, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Дабрачынная акцыя — добры выхаваўчы момант для дзяцей, які спрыяе ўзнікненню такіх якасцей, як дабрыня, спачуванне, міласэрнасць, разуменне таго, што побач ёсць людзі, якія маюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы.

У рамках дабрачыннай акцыі «Падары новую цацку дзіцяці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі» педагогі наведалі сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, і ўручылі падарункі.

У рамках акцыі «Міласэрнасць» педагогі і выхаванцы разам з бацькамі сабралі цацкі, прысмакі, канцылярскія тавары, гігіенічныя сродкі дзецям з дзіцячага сацыяльнага прытулку г. Баранавічы; дыдактычныя цацкі па сэнсарнаму развіццю для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі дзяржаўнай установы «Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Баранавіцкага раёна»; гульні і дапаможнікі, цёплыя рэчы дзецям дзяржаўнай установы «Гарадзішчанскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця»; падгузнікі, сродкі асабістай гігіены, цацкі, адзенне маленькім пацыентам установы аховы здароўя «Баранавіцкая дзіцячая гарадская бальніца», якія засталіся без апекі бацькоў; набылі сродкі асабістай гігіены для ляжачых хворых і арганізавалі вясёлае тэатралізаванае прадстаўленне для пацыентаў Навамышскага хоспіса. Вынікам такіх акцый становіцца фотарэпартаж і інфармацыя для бацькоў на сайце дзяржаўнай установы адукацыі «Навамышскі яслі-сад».

**Заключэнне.** Дзякуючы выкарыстанню такой формы работы, як арганізацыя акцый і дабрачынных мерапрыемстваў, ствараецца і ўмацоўваецца творчы саюз бацькоў, педагогаў і дзяцей, які будуецца на аснове супрацоўніцтва, даверу адзін да аднаго. Адбываецца выхаванне якасцей асобы, набыццё выхаванцам вопыту жыцця сярод аднагодкаў і дарослых.

Такім чынам, крэатыўныя формы работы з бацькамі ствараюць адзіны, згуртаваны, дружны калектыў дзяцей, бацькоў і педагогаў, раскрываюць найшырэйшыя магчымасці для арганізацыі сумеснай працы ў трыядзе "сям'я — дзіця — дзіцячы сад", з'яўляючыся эфектыўным механізмам рэалізацыі вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. — 478 с.

2. *Калядзіч, Н.* Партнёрства ў інтарэсах дзіцяці [Электронный ресурс] // Настаўн. газ. 03.11.2016. — Режим доступа: https://nastgaz.by/partnyorstva-u-intaresah-dzitsyatsi/ . — Дата доступа: 12.12.2020.

3. Эффективные формы взаимодействия ДОО с семьями воспитанников в условиях реализации Федерального государственного образовательного стандарта дошкольного образования / авт.-сост. Е. В. Ковалёва [и др.]. — Иркутск : ГАУ ДПО ИРО, 2017. — 109 с.



Репозиторий БарГУ